ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
20 кастрычніка
1994 года
№ 9(1714)

● ЮБІЛЕІ

## Журфак! Віншуем цябе з 50-годдзем!

## КРЫНІЦА МУДРАСЦІ XXI СТАГОДДЗЯ

Наш факультэт быў створаны ў 1944 г. як адзін з важных фактараў маральна-палітычнага аднаўлення Беларусі. На папялішчы страшэннай вайны людзям патрэбна было мудрае слова, моцная вера, цвёрдае перакананне, што за найярчэйшым святам Перамогі наступіць шчаслівае жыццё.

Факультэт журналістыкі запатрабавала эпоха. Першым у СССР ён узнік у цэнтры ўсходне-славянскага кнігадруку як прадаўжэнне ў сучаснасці гуманістычных, асветніцкіх традыцый вялікага Ф. Скарыны. Прафесія журналіста стала дзяржаўнай, грамадскі каштоўнай, складала моцны культурны пласт нацыянальнай творчай інтэлігенцыі.

За пяцьдзесят год непарыўнай вучобы калектыў выкладчыкаў выхаваў сорак пяць пакаленняў журналістаў. Каля шасці тысяч маладых людзей атрымалі дыпломы. Іх талент па маленькай касмічнай часціцы ўвайшоў у інтэлект беларускага народа. Чатырыста замежных грамадзян з дыпломамі журфака працуюць у ста краінах свету.

З факультэта вырас самы масавы творчы Саюз журналістаў Рэспублікі, нашы выпускнікі складаюць палову Саюза пісьменнікаў Беларусі, сталі майстрамі ў іншых творчых арганізацыях. Беларускія журналісты сталі шукальнікамі праўды, разведчыкамі будучыні, захавальнікамі маралі і ахоўнікамі чалавечай асобы. Яны ўтварылі гуманістычны саюз, які зберагае і развівае нацыянальныя традыцыі, беларускую мову, публіцыстыку і літаратуру, і ніколі не здраджвалі гэтым святыням.

Такая вялікая пашана — вядомым публіцыстам, паэтам і празаікам і яшчэ ў большай меры сотням і тысячам журналістаў раённых і абласных газет, радыё і тэлебачання. Гэтыя творцы атрымалі ганаровае права асабістага подпісу пад летапісам складанай, але слаўнай гісторыі беларускага народа.

Гістарычным фактам стала тое, што ў пасляваенныя гады ў Беларусі на навуковай універсітэцкай аснове ўзнікла новая культуралагічная галіна — журналістыка, якая засвоіла публіцыстычны вопыт К. Каліноўскага, Я. Купалы, К. Чорнага і іншых майстроў і выйшла на міжнародны ўзровень адлюстравання рэчаіснасці.

Спрыяльнай акалічнасцю ў гэтым працэсе ва універсітэце было нараджэнне вопытных навукоўцаў, якія вядуць распрацоўку праблем гісторыі, тэорыі і практыкі беларускіх сродкаў камунікацыі, публіцыстыкі, мовы і літаратуры. На факультэце абаронена больш ста кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, што прама звязана з высокім узроўнем майстэрства беларускай публіцыстыкі і моцным яе ўздзеяннем на грамадскую свядомасць.

Спецыфічная сістэма навучання на факультэце дала падставы для праяўлення яшчэ адной сацыяльна важнай функцыі — падрыхтоўкі шэрагу вядомых дзяржаўных, палітычных і грамадскіх дзеячоў нашай краіны. Старшыня Урада, рэктар універсітэта, дэпутаты парламента, міністры — такі шырокі грамадскі статус выпускнікоў журфака.

Адсюль вынікае, што факультэт выйшаў за межы акадэмічнай установы і вузкапрафесійнай падрыхтоўкі і ператвараецца ў спецыфічны інстытут сувязі дзяржаўных і навуковых структур з грамадствам.

Сёння на факультэце займаецца 600 студэнтаў, працуе сорак выкладчыкаў, у тым ліку восем дактароў навук. Вучэбны працэс здзяйсняюць пяць спецыялізаваных кафедраў і пяць тэхнічных лабараторый. Студэнты выпускаюць дзве газеты: «Журналіст» і «Студэнцкі экспрэс». Арганізавана аспірантура і савет па абароне кандыдацкіх дысертацый. Вытворчую практыку студэнтаў арганізоўваюць найбольш вопытныя публіцысты рэспубліканскіх газет, радыё і тэлебачання. Большая палова студэнтаў пасля другога курса працуюць у сродках камунікацыі.

Паўвека мінулага — гэта творчы скарб для будучага развіцця факультэта. У новае тысячагоддзе ён ідзе з цікавейшай шырокай перспектывай. У сувязі з тым, што ў бліжэйшым будучым ніякая партыя не зойме першаснага месца ў грамадскім жыцці, журналістыка і публіцыстыка стануць амаль асноўным фактарам фарміравання стваральнай грамадскай думкі. Такая перспектыва развіцця журналісцкай прафесіі ў злучанасці з вострымі сацыяльна-эканамічнымі праблемамі нашай краіны вызначае неабходнасць значнага павелічэння факультэта. Тым больш, вельмі хутка пашыраецца і сфера прымянення журналісцкай працы. Для больш глыбокай падрыхтоўкі спецыялістаў плануецца адкрыццё на факультэце аддзяленняў друку, радыё і тэлебачання, літаратурнага і міжнароднай журналістыкі.

Увесці ў вучэбны план увесь спектр спецыялізацый нацыянальных сродкаў камунікацыі не толькі па кваліфікацыйнаму прызнаку: дыктар, апаратар, крытык і г. д.,— але і па тэматычнаму накірунку: журналіст-эканаміст, эколаг, псіхолаг і інш.

Арганізацыйнае ўдасканаленне факультэта дазволіць пашырыць прыём студэнтаў да 100—150 чалавек. Гэта патрабуе сучасная сістэма сродкаў камунікацыі Рэспублікі, дзе занята толькі тры з паловай тысячы журналістаў, а патрэбна каля сямі тысяч. Таму на факультэце трэба сабраць усю творчую моладзь Беларусі. У гэтым выпадку факультэт будзе расціць таленты і стане крыніцай мудрасці і пазнання для юнакоў і дзяўчат, якія будуць працаваць на творчай ніве ўжо ў новым стагоддзі.

Гісторыя беларускага народа прадаўжаецца. Яе яркі публіцыстычны вобраз 50 гадоў пішуць журналісты, выпускнікі нашага факультэта. Яны сталі не толькі аўтарамі слаўнага летапісу факультэта, але і яго героямі.

З юбілеем роднага факультэта, шаноўныя калегі!

**Дэкан факультэта А. Г. СЛУКА**

## З журфакам — па жыцці

Адно неканкрэтнае пытанне, што гучала прыблізна як «Што для цябе журфак?», было зададзена днямі студэнтам нашага факультэта. І вось якія цікавенькія адказы атрымаліся:

Журфак...

— Гэта ўсё! І крышачку болей...

— Амаль нічога. Скалечанае жыццё!...

— Сродак ад арміі.

— Вось гавораць, што школа і гэтак далей... Цеснае памяшканне, дзе цябе ніхто не чакае. Вядома, прафесары могуць даць нешта каштоўнае, але...

— Мае сябры, студэнты, — усе вельмі цікавыя асобы і вясёлыя да таго ж. Прыходжу, каб пабачыцца з імі.

— Часовы прытулак.

— Журфак — гэта дыягназ.

— Сябры перш-наперш. Ёсць цікавыя дысцыпліны, але мы іх вывучаем толькі павярхоўна. Гавораць: журналіст — асоба, якая можа працяглы час размаўляць аб тым, пра што не мае ніякага ўяўлення. І гэта сумна.

— Жорсткая жыццёвая неабходнасць.

— Магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю.

— Гэта манера паводзінаў.

— Магчымасць выйсці замуж (але не за журналіста).

— Крыніца стыпендыі. Ну і ведаў, зразумела.

— Сродак трапіць у «вышэйшы свет».

— Новая тусоўка.

— Выдатны спосаб самарэалізацыі. Не ведаю, як іншыя, а я вельмі змянілася пасля таго, як паступіла сюды. Адкрылася мноства магчымасцей, праблема толькі ў вартай іх рэалізацыі.

— Лепей журфака нічога няма!

**Распытвала Кацярына ТУЗАВА, студэнтка 2-га курса факультэта журналістыкі**

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** вышэйшай алгебры, гісторыі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры;

**ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ** фізікі паўправаднікоў;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, сусветнай і айчыннай гісторыі, філасофіі і метадалогіі навукі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, надзейнасці вырабаў радыёэлектронікі, фізічнай электронікі, інфарматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, тэхналогіі праграміравання (0,25 стаўкі), матэматычнага забеспячэння САПР, агульнай матэматыкі, ураўненняў матэматычнай фізікі, батанікі, агульнай экалогіі, гісторыі беларускай літаратуры;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, эканамічных навук, фізічнай электронікі, інфарматыкі, вышэйшай алгебры, тэорыі функцый, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, сучаснай беларускай мовы, тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі, гісторыі журналістыкі і літаратуры, фізічнага выхавання і спорту;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, сучаснай беларускай мовы, фізічнага выхавання і спорту;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, методыкі выкладання матэматыкі, заалогіі.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце «Беларускі універсітэт» 20 кастрычніка 1994 года.

## Фядута быў у «кузні кадраў»

Шэф упраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі адміністрацыі Прэзідэнта спадар Фядута 11 кастрычніка наведаў факультэт журналістыкі. Пасля кароткай аўтабіяграфічнай прамовы Аляксандр Іосіфавіч пазайздросціў журналістам, што яны могуць яго крытыкаваць, а ён павінен толькі адказваць. Зала была поўнай: хтосьці выразаў сняжынкі з прамакаткі, хтосьці вучыў рускую мову, старэйшыя студэнты лузалі семачкі. Было вельмі кепска чуваць як пытанні, так і адказы. Застаецца спадзявацца, што ў хуткім часе пасля візіта паставяць у актавай зале журфака мікрафон. Усеагульную ўвагу Аляксандр Іосіфавіч прыцягнуў асабліва ў той момант, калі абвяргаў чуткі аб сваім вяселлі са скандальна вядомай журналісткай Цінай Клыкоўскай. Фядута заявіў, што ў яго добры густ і ён ажэніцца з іншай дзяўчынай. Былі абмеркаваны таксама пытанні «Звязды» і «Беларускай маладзёжнай», эканомікі, маралі і некаторыя моманты выхавання дзяцей, што асабліва запомніліся Фядуту з часоў яго работы ў школе № 20 горада Гродна. Вельмі цяжка было Аляксандру Іосіфавічу выкладаць дзецям творы Дастаеўскага.

Сустрэча прайшла ажыўлена, хаця актыўных студэнтаў было няшмат.

Скончылася ўсё апладысментамі, якія заглушылі адказ Фядуты на пытанне дэкана А. Г. Слукі аб дапамозе журфаку з боку самога Аляксандра Іосіфавіча.

**А. ПАЎЛОЎСКІ**

## ПАДПІСКА-95

З 12 кастрычніка па 25 лістапада праводзіцца падпіска на газеты і часопісы на першае паўгоддзе 1995 года.

У каталогу рэспубліканскіх падпісных выданняў часопіс «Веснік БДУ» знайсці няцяжка: сярод падобных сабе ён адзін з самых танных. Падпісная цана па серыях такая:

СЕРЫЯ I (Інд. 74851) — фізіка, матэматыка, механіка (№ 1 студзень, № 2 май) — 2400 рублёў;

СЕРЫЯ II (Інд. 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1 люты, № 2 чэрвень) — 2400 рублёў;

СЕРЫЯ III (Інд. 74853) — гісторыя, філасофія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1 сакавік) — 1200 рублёў;

СЕРЫЯ IV (Інд. 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (№ 1 красавік) — 1200 рублёў.

Падпіска на часопіс «Веснік БДУ» прымаецца ва ўсіх аддзяленнях сувязі і прадпрыемстваў «Белсаюздруку».

Нагадваем, што ў розпічны продаж часопіс не паступае.

**Рэдакцыя і рэдкалегія часопіса**

● НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

# СПРАВАЗДАЧА РЭКТАРА БДУ ФЁДАРА МІКАЛАЕВІЧА КАПУЦКАГА

Ва ўмовах эканамічнага крызісу, які ўсё больш нарастае, вышэйшая школа рэспублікі сутыкнулася з шэрагам цяжкавырашальных праблемаў. Як захаваць традыцыі класічнага універсітэта, як спалучаць фундаментальную навуковую падрыхтоўку студэнтаў у галінах прыродазнаўчых і гуманітарных навук з сённяшнімі запатрабаваннямі рынку? Як павысіць сацыяльную абароненасць нашых выпускнікоў, іх адаптацыйныя магчымасці да новых рэаліяў жыцця?

Парадоксы грамадскага развіцця патрабуюць ад нас нестандартных рашэнняў у вызначэнні стратэгіі развіцця універсітэта. Зразумела, мы разлічваем на разумны, дзяржаўны падыход новых палітыкаў да вышэйшай школы і да адукацыі ў цэлым, на тое, што вядучыя ВНУ змогуць прадоўжыць сваю працу як дзяржаўныя ўстановы.

Аднак не выключаецца і іншы варыянт. Пагэтаму мы павінны быць падрыхтаваныя да скарачэння фінансавання з бюджэту дзяржавы, да звужэння дзяржаўнага заказу на спецыялістаў.

У гэтых умовах рэктарату, кіраўнікам падраздзяленняў і службаў неабходна шукаць магчымасці, вельмі часта нетрадыцыйныя, для захавання кадравага, навуковага патэнцыялу універсітэта. Бо гэта ж галоўны набытак, галоўны скарб ВНУ.

Адной жа з галоўных перадумоваў выжывання навуковых школаў, падраздзяленняў і факультэтаў універсітэта ў цэлым з'яўляецца менавіта ўзбуйненне фінансавай незалежнасці ВНУ. Першыя крокі ў гэтым кірунку універсітэт зрабіў. У мінулым і сёлетнім навучальным годзе ішло павелічэнне прыёму студэнтаў па кантрактах з фізічнымі і юрыдычнымі асобамі за аплату. Цяпер на стацыянары платна вучыцца больш 550 чалавек, на завочнай форме навучання — 1200 студэнтаў. Пераважная большасць іх сканцэнтравана на юрыдычным, гістарычным, філасофска-эканамічным факультэтах, а таксама на факультэце журналістыкі. Прыярытэт, такім чынам, за гуманітарнымі факультэтамі. Выключэннем на прыродазнаўчых факультэтах ёсць факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. У бягучым навучальным годзе на камерцыйнай аснове тут прынята 43 студэнты (плюс 152 чалавекі за кошт фінансавання з бюджэту). На фізічным, хімічным факультэтах, на жаль, па кантрактах не залічана ніводнага студэнта. Сур'ёзны сімптом. Кіраўніцтву факультэтаў, кафедраў трэба шукаць сабе сваю нішку ва ўмовах рынку. Чакаць, што вырашыцца ўсё само цераз сябе, па меншай меры, безадказна.

Сваю фінансавую незалежнасць універсітэт у пэўнай ступені можа звязаць з павелічэннем прыёму замежных студэнтаў. Аднак на працягу апошніх гадоў лічба замежных студэнтаў здрабнела — да 30—40 чалавек на асноўных факультэтах, да 70—80 чалавек на падрыхтоўчым факультэце. І — зноўку паўтараю — ініцыятыва павінна быць за факультэтамі.

Неабходна больш смела ісці на распрацоўку і рэалізацыю разнастайных камерцыйных праектаў, прыцягванне айчыннага і замежнага капіталу. Сярод такіх праектаў: будаўніцтва жылога дома, стварэнне банка, праекты рэканструкцыі інтэрнатаў.

Аднак і тут шмат праблемаў.

Нашы службы не ўсвядомілі неабходнасць пошуку шляхоў заробку сродкаў. Зразумела, прасцей грошы лічыць у чужой кішэні.

Выжывальнасць універсітэта мы звязваем таксама з пашырэннем пераліку спецыяльнасцей, запатрабаваных нашым рынкам, грамадствам пераходнага перыяду. Размова ідзе перш за ўсё аб падрыхтоўцы спецыялістаў па новых галінах ведаў. Ва універсітэце быў праведзены набор на аддзяленні эканамічнага профілю: міжнародных эканамічных зносін, эканомікі і кіраўніцтва вытворчасцю; працягнуты быў прыём на аддзяленні эканамічнай тэорыі, эканамічнай кібернетыкі (спецыяльнасці, вядома, прэстыжныя).

Значная работа па адкрыццю новых спецыяльнасцей праведзена ў мінулым навучальным годзе на філалагічным факультэце. Нягледзячы на цэлы шэраг праблем, выкліканых беспрэцэдэнтна хуткім ростам гэтага факультэта, тут ужо вымалёўваецца даволі зладжаная сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў па асноўных напрамках філалагічнай навукі з улікам спецыфікі беларускай нацыянальнай культуры і тых традыцый, якія назапашаны за апошнія гады ў Белдзяржуніверсітэце. Сярод гэтых напрамкаў неабходна выдзеліць: 1) беларускую філалогію; 2) рускую філалогію; 3) славянскую філалогію; 4) класічную філалогію.

Праведзена таксама адпаведная праца па стварэнню аддзялення рамана-германскай філалогіі.

Гэту працу патрэбна ўсяляк вітаць і стымуляваць, каб у самы бліжэйшы час філалагічны факультэт змог стаць Рэспубліканскім цэнтрам філалагічнай адукацыі ў поўным і класічным змесце гэтага слова.

У 1993—1994 навучальным годзе на юрыдычным, гістарычным факультэце, а таксама на факультэце журналістыкі працягвалася работа па стварэнню больш рацыянальнай і перспектыўнай структуры гэтых факультэтаў з мэтай акцэнтаваць увагу на тых спецыяльнасцях, якія з'яўляюцца найбольш актуальнымі і неабходнымі для Беларусі. Дарэчы, аддзяленне паліталогіі было пераведзена з ФЭФа на юрыдычны факультэт, на факультэце журналістыкі праведзена падрыхтоўчая праца па адкрыццю шэрагу новых творчых спецыяльнасцей, якія дазволяць рыхтаваць спецыялістаў-экспертаў у асобных галінах культуры, навукі, сацыяльнага прагназіравання.

Па новых спецыяльнасцях прыняты ў гэтым навучальным годзе студэнты на геаграфічным (экалогія, геалогія), хімічным, біялагічным (экалогія) факультэтах. Мы разлічваем, што ўсё гэта павінна павысіць канкурэнтаздольнасць універсітэта.

Хачу асобна падкрэсліць, што мы тут робім толькі першыя крокі. Нас сур'ёзна трывожыць перспектыва развіцця факультэтаў прыродазнаўчага профілю. На жаль, сур'ёзных разлікаў, перспектыўных прапаноў пакуль няма.

У мінулым навучальным годзе была працягнута мэтанакіраваная работа па развіццю і мадэрнізацыі сістэмы гуманітарнай адукацыі і навуковых даследванняў у галіне сацыяльна-гуманітарных ведаў. Работа, праводзімая ў гэтым напрамку, усё больш відавочна пацвярджае абгрунтаванасць міжнародных стандартаў, паводле якіх атрыбутам класічнага універсітэта з'яўляецца наяўнасць у яго структуры развітай сістэмы гуманітарнай адукацыі. Зараз на 5 гуманітарных факультэтах навучаецца больш 50 % усіх студэнтаў універсітэта, у сферы сацыяльна-гуманітарнай адукацыі заняты 90 прафесараў, што складае 48 % ад іх агульнай колькасці ў БДУ.

Тэндэнцыі тут такія, што за апошнія два гады ва універсітэце створаны 11 новых кафедраў па розных напрамках сацыяльна-гуманітарных ведаў, што дазволіла ў мінулым навучальным годзе адкрыць падрыхтоўку студэнтаў па шэрагу новых перспектыўных спецыяльнасцяў.

Далейшае творчае і дынамічнае развіццё гуманітарнай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэце прадугледжвае сістэмную распрацоўку сучаснага праграмна-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу і найноўшых адукацыйных тэхналогій.

Без такой работы цяжка будзе прэтэндаваць на паспяховае выкананне вызначанай праграмы мадэрнізацыі гуманітарнай адукацыі ва універсітэце. Тут трэба адзначыць важнасць і безумоўную актуальнасць той дзейнасці, якая праводзілася пад кіраўніцтвам Навукова-метадычнага Савета і была звязана з арганізацыяй прафесіянальнай экспертызы і аналізу вучэбных планаў, якія вызначаюць важнейшыя параметры працэсу навучання па асноўных спецыяльнасцях, якія маюцца ва універсітэце. Мне здаецца, што час дэструктыўных тэндэнцый і размывання дзяржаўных стандартаў у галіне адукацыі праходзіць. Бязмерная аўтанамізацыя факультэтаў і дэцэнтралізацыя кіравання вучэбным працэсам, побач з некаторымі станоўчымі момантамі, нарадзілі і сур'ёзныя адмоўныя вынікі, якія вядуць часам да элементаў анархіі і неабгрунтаванага самаўпраўства з боку асобных дэканаў. З такімі з'явамі нам неабходна пакончыць, і таму важна працягваць і актывізаваць работу Навукова-метадычнага Савета універсітэта ў мэтах назірання за няўхільным выкананнем сучасных патрабаванняў адукацыйных стандартаў, якія прад'яўляюцца да класічнай універсітэцкай адукацыі.

У гэтых мэтах важна забяспечыць пастаяннае творчае ўзаемадзеянне факультэтаў універсітэта з Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных навук, які мэтанакіравана і сістэматычна распрацоўвае праблемы аптымальнай структуры і змястоўна-тэматычнай накіраванасці гуманітарнай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў адпаведнасці з сучаснымі падыходамі і канцэпцыямі. Толькі пры ўмове значнай актывізацыі і ўзняцці аўтарытэту гэтых агульнауніверсітэцкіх структур мы зможам адэкватна рэагаваць на такія новыя і ў многім пакуль нязвыклыя для нас з'явы, як рэзкае павелічэнне жадаючых атрымаць гуманітарную адукацыю ў універсітэце на кантрактнай аснове, рост ліку студэнтаў, якія навучаюцца адначасова па дзвюх спецыяльнасцях, і іншыя формы платных адукацыйных паслуг.

Не сакрэт, што ў гэтай новай галіне камерцыйнай дзейнасці універсітэта пакуль дамінуюць стыхійныя і сітуацыйныя падыходы.

Неабходна тэрмінова распрацаваць сістэму гэтай дзейнасці, рэзка пашырыць яе маштабы і разам з тым ажыццяўляць яе ў адпаведнасці з прадуманай і метадычна абгрунтаванай тэхналогіяй.

Думаю, што на сённяшні дзень — гэта адзін з важнейшых прыярытэтаў развіцця адукацыі ў універсітэце па такіх спецыяльнасцях, як правазнаўства, эканоміка, псіхалогія, сацыялогія, філалогія, журналістыка, гісторыя і інш.

Элементы рынгачнай інфраструктуры інтэнсіўна пранікаюць у адукацыю, што ставіць пад сумненне многія традыцыйныя канцэпцыі і замацаваныя падыходы ў ацэнцы ролі і значэння гуманітарнай і прыродазнаўча-навуковай адукацыі. Ігнараваць гэтыя рэальнасці сёння ўжо немагчыма без рызыкі аказацца на абочыне сучасных працэсаў развіцця адукацыі.

Неабходна больш аператыўна рэагаваць на сучасную кан'юктуру попыту на адукацыйныя паслугі. Нават самы павярхоўны аналіз вынікаў нядаўняга прыёму ва універсітэт паказвае, што неабходна рэзка пашырыць базу эканамічнай, псіхалагічнай адукацыі і іншых папулярных напрамкаў і спецыяльнасцей.

У сувязі з гэтым адной з неадкладных задач з'яўляецца хутчэйшае вырашэнне пытання аб арганізацыі эканамічнага факультэта, у рамках якога неабходна сканцэнтраваць усю работу па развіццю эканамічнай адукацыі і прыдаць сістэмны характар тым ініцыятывам і навацыям у гэтай галіне, якія маюць месца на факультэтах прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, механіка-матэматычным, філасофска-эканамічным. Думаю, што тэзіс аб адкрыцці эканамічнага факультэта ў Белдзяржуніверсітэце самавідавочны і не мае патрэбы ў дадатковых аргументах хоць бы таму, што наяўнасць такога факультэта — неад'емны атрыбут кожнага сучаснага класічнага універсітэта.

Таму на працягу 1994—1995 навучальнага года неабходна правесці адпаведную работу па адкрыццю кафедраў, абаснаванню аптымальнай структуры факультэта, вырашэнню кадравых пытанняў і матэрыяльна-тэхнічнай базы эканамічнага факультэта, каб у самы бліжэйшы час пачаць падрыхтоўку спецыялістаў па эканамічных навуках на грунтоўнай аснове.

Час уладарна патрабуе пошуку новых падыходаў да арганізацыі ўсяго універсітэцкага жыцця. Размова ідзе не толькі пра пастаноўку вучэбнай і навуковай работы, пра адкрыццё новых спецыяльнасцей і спецыялізацый, удасканаленне дзейнасці факультэтаў і падраздзяленняў, але і ў значнай ступені пра пошук новых фінансавых магчымасцяў ВНУ. Чакаць павелічэння дзяржаўнага фінансавання — значыць, асуджаць універсітэт, няхай і на маруднае, але сталае скарачэнне і набору студэнтаў, і аб'ёму навуковых даследванняў.

У сувязі з тым, што загадам Міністэрства адукацыі і навукі № 183 ад 17 чэрвеня 1993 года Белдзяржуніверсітэт вызначаны галоўным па распрацоўцы тыпавых вучэбных планаў, кваліфікацыйных характарыстык і праграм агульнаадукацыйных дысцыплін, Навукова-метадычны Савет асноўную ўвагу ўдзяляў у сваёй рабоце экспертнаму аналізу і абмеркаванню распрацаваных вучэбных планаў. Па стану на 13.09.94 г. Міністэрствам зацверджаны вучэбныя планы па спецыяльнасцях філалагічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі. У бліжэйшы час будуць зацверджаны вучэбныя планы па спецыяльнасцях «Хімія» і «Біялогія». Другія планы або вернуты Міністэрствам ці Навукова-метадычным Саветам на дапрацоўку, або не падаваліся наогул. Не паступалі на разгляд вучэбныя планы юрыдычнага і філасофска-эканамічнага факультэтаў, акрамя спецыяльнасці «Псіхалогія». Фактычна па большасці спецыяльнасцей навучанне вядзецца па незарэгістраваных вучэбных планах, што недапушчальна ў дзяржаўнай навучальнай установе.

Перагляд вучэбных планаў, увядзенне новых спецыяльнасцей, пераход навучальнага працэсу на беларускую мову немагчымыя без выдання падручнікаў і метадычных дапаможнікаў. Сёння ж практычна паралізавана выдавецкая дзейнасць.

Такі стан нас ніяк не можа задавальняць. Трэба ствараць свой мабільны рэдакцыйна-выдавецкі цэнтр, здольны забяспечыць выданне вучэбнай і навуковай літаратуры. Акрамя таго, варта стварыць спецыяльны фонд для фінансавання выдавецкай дзейнасці, прадугледжваючы адлічэнні ў яго даходаў падраздзяленняў.

Цяпер у інфармацыйна-вылічальным цэнтры універсітэта маюцца тры універсальныя ЭВМ тыпу ЕС, якія закуплены ў 1985—1989 і 1990 гг. Неабходна адзначыць, што далейшае выкарыстанне ЭВМ з'яўляецца бесперспектыўным як з пункту гледжання арганізацыі вучэбнага працэсу, так і з пункту гледжання эксплуатацыі аўтаматызаванай сістэмы кіравання БДУ. Гэтыя ЭВМ з'яўляюцца маральна ўстарэлымі і не дазваляюць весці навучанне з выкарыстаннем сучасных тэхналогій распрацоўкі праграмных сродкаў.

На сённяшні дзень ва універсітэце маецца 607 персанальных ЭВМ тыпу ЕС-1840 і іншых. Частка іх аб'яднана ў вучэбныя класы. Але неабходна адзначыць, што персанальныя ЭВМ такога тыпу набываліся, у асноўным, у перыяд з 1989 па 1990 гады і цяпер яны ўжо не адпавядаюць сусветнаму ўзроўню развіцця вылічальнай тэхнікі, гэта значыць — іх можна лічыць устарэлымі маральна, а ў сувязі з нізкай якасцю іх вырабу — і фізічна.

На базе адносна сучасных сродкаў вылічальнай тэхнікі створаны вучэбныя класы на факультэтах прыкладной матэматыкі, фізічным, радыёфізікі і электронікі і юрыдычным. Прыблізная ацэнка патрэбы універсітэта ў вылічальнай тэхніцы для вучэбных і навуковых мэт дае наступныя вынікі: для навуковай работы неабходна каля 300 персанальных ЭВМ тыпу IBM-386, 486; для вучэбнай работы і забеспячэння навукова-даследчай работы студэнтаў — 380 персанальных ЭВМ, пры сярэдняй працягласці работы студэнта на ЭВМ — 3 гадзіны; дзеля забеспячэння інфармацыйных патрэб універсітэта — 50 персанальных ЭВМ (забеспячэнне ўнутранай інфармацыйнай сеткі універсітэта і аўтаматызацыі работы бібліятэкі).

Аб работах па аўтаматызацыі бібліятэкі неабходна сказаць асобна. Рэктарат плануе правесці ў бліжэйшы час наступныя работы:

1. Увядзенне электроннага каталога бібліятэкі (работы выконваюцца).
2. Забеспячэнне доступу да электроннага каталога карыстальнікаў у чытальных залах з рабочых станцый, у тым ліку і аддаленых карыстальнікаў (Шчомысліца, гістфак, філфак і г. д.).
3. Падключэнне бібліятэкі БДУ да інфармацыйных рэсурсаў другіх бібліятэк і прадастаўленне бібліятэкам іншых ВНУ магчымасці карыстацца электроннымі каталогамі нашай бібліятэкі.

У ліпені бягучага года універсітэт атрымаў грант фонда «Еўразія» на суму 22439 долараў ЗША для арганізацыі камп'ютэрнай сеткі ВНУ Беларусі. Праектам прадугледжана набыццё на працягу навучальнага года рабочай станцыі, трох ЭВМ IBM-486 і шасці тэлефонных мадэмаў.

У цэлым можна канстатаваць, што становішча з забеспячэннем сучаснай вылічальнай тэхнікай і перааснашчэннем падраздзяленняў будзе знаходзіцца ў полі зроку рэктарата і будуць вышуквацца неабходныя сродкі нават з нашага сціплага бюджэту.

Яшчэ аб адным. Асаблівы неспакой выклікае ў нас стан справаў у студэнцкім асяроддзі. Вядома спасылка на ўсеагульнае бязладдзе можа таго-сяго пэўным чынам суцешыць. Але ёю ніяк нельга апраўдаць бяздзейнасць у рабоце з моладдзю. Парадаксальная сітуацыя: больш інфармацыі — менш разумення, больш дэмакратыі — менш парадку. Мы згубілі кіраванне выхаваўчым працэсам.

*(Пачатак. Працяг у наступным нумары.)*

## ● ВЕСТКІ З ГАЛОЎНАГА КОРПУСА

Як паведаміў карэспандэнту «Беларускага універсітэта» **Вользе ХАДАРЭНКА** начальнік упраўлення па міжнародных сувязях **В. Г. ШАДУРСКІ,** палякі ўсё больш цікавяцца Беларуссю. Здараецца, што беларускія выкладчыкі, якія па абмену працуюць у польскіх універсітэтах, усё часцей замяшчаюць польскіх выкладчыкаў, што паехалі працаваць на Захад.

8 кастрычніка 1994 года Белдзяржуніверсітэт наведала дэлегацыя з Сілезскага універсітэта (г. Катавіцэ) на чале з рэктарам. Абмяркоўваліся магчымасці супрацоўніцтва. Трэба адзначыць, што БДУ ужо мае даўнія і цесныя сувязі з іншымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Польшчы, сярод якіх вядомыя — Люблінскі універсітэт імя М. Кюры-Складоўскай, Ягелонскі універсітэт у Кракаве, Варшаўскі універсітэт, Педагагічны інстытут у Кельцэ і інш.

Таму наладжванне сувязей з Сілезскім універсітэтам — гэта яшчэ адзін крок на шляху да аналагічнага супрацоўніцтва з Захадам. А Польшча — прамежкавая, але важная прыступка на гэтым шляху.

● СТУДЭНТ І ВОЛЬНЫ ЧАС

# ВОСЕНЬ. ЗАПРАШАЮЦЬ ТЭАТРЫ

Для кожнага восень значыць нешта сваё. Для адных — гэта пачатак вучобы, для іншых — сумны час развітання з сябрамі, а для кагосьці — магчымасць пабыць адзін на адзін са сваімі думамі і паназіраць за казачнымі пераўтварэннямі ў прыродзе. Восень заўжды дорыць чароўныя, ласкавыя дні... А для мяне, студэнткі 3 курса БДУ факультэта журналістыкі, гэта яшчэ і пара адкрыцця тэатральнага сезону. Тэатральны сезон звычайна пачынаецца прэм'ерай, гэта нібыта тэатр збірае сваіх старых сяброў, каб зноў нагадаць аб той прыгажосці, якая існуе вакол нас, і якую мы, нават маладыя, але ўжо заклапочаныя, крыху стомленыя, усё радзей і радзей знаходзім час, каб заўважыць.

— А ўсё ж такі якую ролю адыгрывае тэатр у нашым жыцці? — пытаюся ў Таццяны, студэнткі 3 курса філфака.

— Для мяне асабіста гэта не проста забава, гэта нешта большае... Нават пасля забаўляльных спектакляў, спектакляў-вадэвіляў, дзе ўражвае толькі прыгожае відовішча: стракатыя касцюмы, танцы — хочацца ўсміхацца і радавацца. Іншымі словамі, жыць хочацца...

Але ж як часта наш агульны настрой можна вызначыць абыякавасцю да ўсяго, што адбываецца з намі, нежаданнем марыць аб будучыні, тугой. І як важна, што ёсць людзі, якія імкнуцца змяніць нешта ў сваім жыцці, якія знаходзяць тую прыгажосць, якая хвалюе, моцна ўражвае і адначасова прыносіць вялікае задавальненне.

Зноў пытаюся ў Таццяны, ці шмат хто з яе аднакурснікаў, будучых філолагаў, наведвае тэатры.

— Ведаеш,— адказвае яна,— па-рознаму. Усё залежыць ад асабістага ўспрыняцця свету, або ад унутранай культуры чалавека. Есць студэнты, якія па-праўднаму любяць тэатр, адчуваюць патрэбу бываць там, ёсць і такія, якія робяць гэта без асаблівай зацікаўленасці, таму што так прынята. Аднак і тых, і другіх меншасць. Большая частка студэнтаў з абыякавасцю ставіцца да тэатраў, магчыма, як і да ўсяго астатняга.

Дзіўная, на мой погляд, сітуацыя. Бо, здаецца, каму, як не будучым філолагам, цікавіцца тэатрам, таму што тэатр — гэта яшчэ адзін момант адраджэння нацыянальнай культуры. І вельмі значна, каб са сцэны тэатра гучала чыстая, самабытная, прыгожая мова.

А ўсё ж такі чаму моладзь не любіць тэатр? Вырашаю запытаць аб гэтым у студэнтаў, якія стаяць за булачкамі на першым паверсе галоўнага корпуса універсітэта.

— Чаму не любім? Любім, аднак часу няма пакуль хадзіць. Вучыцца трэба, а яшчэ і грошы зарабляць. Каб было на што пайсці ў тэатр.

— Не цікава.

— Дорага. Грошай нават на ежу не хапае. Які там тэатр...

— Вельмі любім тэатр. Асабліва Купалаўскі. На кожнай прэм'еры пабывалі, і хутка пойдзем на прэм'еру спектакля «Дон Жуан вяртаецца з вайны». А што датычыцца грошай, то білет на гэты спектакль каштуе 1.800 рублёў. Пры нашай стыпендыі гэта не танна, аднак дазволіць сабе хаця б раз у месяц схадзіць у тэатр можна.

Выявілася, што найбольш папулярныя сярод свядомай часткі студэнтаў — Купалаўскі тэатр, Тэатр оперы і балета і тэатр музычнай камедыі. Да новых, нядаўна ўтвораных тэатраў, накшталт тэатра моладзі або тэатра-лабараторыі «Вольная сцэна», ставяцца з асцярогай. А паважлівыя водгукі чула я пра Альтэрнатыўны тэатр і тэатр «Хрыстафор».

Дарэчы, білет у Альтэрнатыўны тэатр на прэм'еру спектакля «Гора ад розуму» па Грыбаедаву каштуе 2000 рублёў, у Рускі драматычны тэатр на прэм'еру спектакля «Свабодны шлюб» — 1200 рублёў, на «Вольную сцэну» на прэм'еру «Барбара Радзівіл» — 100 рублёў, а на прэм'еру оперы Рымскага-Корсакава «Моцарт і Сальеры» білеты каштуюць ад 400 да 700 рублёў.

— Няўжо,— пытаюся ў сваёй будучай калегі, студэнткі журфака, якая іграе ў студэнцкім тэатры «Алігатар»,— справа толькі ў грошах, калі невялікую нават для нашага часу суму лепей пакінуць на 2 батоны хлеба, чым набыць білет у тэатр? Няўжо вінавата толькі наша беднасць, калі думка аб тым, як выжыць, вышэй за ўсе астатнія.

— Не,— адказвае Саша,— справа не ў гэтым. Каб хадзіць у тэатр, яго трэба любіць. І няважна за што. Можна любіць нават зборы ў тэатр, калі надзяваеш вячэрнюю сукенку і робіш прычоску. Каб усё, што звязана з тэатрам, было святам. Тады і прыходзіць любоў да яго. Тэатр — гэта асобны свет, калі рэальнасць зліваецца з тым, што адбываецца на сцэне, і калі за 2 гадзіны, пакуль ідзе спектакль, паспяваеш пражыць цэлае жыццё. І калі ты адчуў гэта аднойчы, то назаўжды палюбіш тэатр. Няшмат, на жаль, у студэнтаў на гэта часу. Не разумеюць тэатр, імкнуцца па-іншаму праводзіць свабодны час. Мабыць калісьці яны ўсё ж такі адкрыюць для сябе гэты свет...

Восень за вокнамі... Такая чароўная і казачная... Яна заве цябе за сабой. Вакол цябе так шмат прыгожага...

**Кацярына ТКАЧЭНКА**

# «Ад мадэрна да нашых дзён»

Так называецца цыкл лекцый аб гісторыі мастацкіх плыняў XX стагоддзя, які аб'яднаў студэнтаў у так званы «студэнцкі клуб». Першая лекцыя цыкла адбылася 6 кастрычніка і была прысвечана мастацтву «канца стагоддзя». У ёй распавядалася аб мастацкіх школах і аб'яднаннях Англіі, Францыі, Германіі, Аўстрыі, Расіі і іншых краін на мяжы XIX—XX ст.

Які час у мастацтве застаецца для нас найменш вядомым? Гэта, безумоўна, мастацтва першай паловы XX стагоддзя — мадэрн і мастацтва нашых дзён. Мадэрн — таму што доўгі час мы не мелі магчымасці дакладна пазнаёміцца з ім. (Доўгі час існаваў толькі адзін акадэмічны падручнік, у якім мадэрн разглядаўся з крытычнага пункту гледжання.) Мастацтва сучасных дзён — мабыць, таму, што так адбывалася заўжды: людзі трапятліва ставяцца да вялікіх тварэнняў мінулага, аднак сучаснае мастацтва не заўжды прымаюць і не заўжды імкнуцца пазнаць. Таму лекцыі, задача якіх даць інфармацыю па гэтых перыядах, арыентуюцца ў першую чаргу на студэнтаў. Бо студэнты, як лічыць арганізатар і вядучая лекцый Вольга Капёнкіна, найбольш успрымальная публіка, а таму хацелася б, каб акрамя ведаў значных імён, твораў, студэнты адчулі і атмасферу мінулага, і жывы пульс сучаснасці.

І яшчэ адзін момант. Нам усім даводзілася чуць, як асоба, якая ніяк не звязана з мастацтвам, пачынае ганьбіць некаторыя з яго праяў. А гэта адсутнасць і ведаў, і звычайнай чалавечай культуры. Таму, я лічу, клубу належыць выхаваўчая функцыя.

Наступныя дзве лекцыі адбудуцца:

20 кастрычніка. ФАВІЗМ: Новая свабода цвету. Маціс і яго значэнне для сусветнай візуальнай культуры XX стагоддзя.

3 лістапада. Тэма ЭКСПРЭСІЯНІЗМ: Эстэтыка і мастацкія аб'яднанні Германіі першых дзесяцігоддзяў XX ст. («Мост», «Сіні коннік»). Дзейнасць Кандзінскага перыяду «Сіняга конніка». Экспрэсіянізм у творчасці рускіх прымітывістаў М. Ларыёнава, Н. Ганчаровай, мастакоў «Бубновага валета». Экспрэсіянізм «парыжскай школы»: Мадыльяні, Шагал, Суцін, Пікасо.

Калі вас зацікавілі тэмы лекцый, то ў гэтыя дні ў 16.30 вас чакаюць па адрасу: Вул. Леніна, 20. Нацыянальны мастацкі музей РБ.

**Кацярына ТКАЧЭНКА**

● УВАГА — КОНКУРС!

# МЕЖДУНАРОДНАЯ СОРОСОВСКАЯ ПРОГРАММА ОБРАЗОВАНИЯ В ОБЛАСТИ ТОЧНЫХ НАУК

Совет международной Соросовской программы образования в области точных наук рассмотрел и одобрил новые программы, которые будут осуществляться в Беларуси, России и на Украине до конца текущего года. Контактный телефон в Минске — 0172-39-57-45. Почтовый адрес: 220072, г. Минск-72, Международная Соросовская программа образования в области точных наук.

### ПОДПРОГРАММА СОРОСОВСКИЕ АСПИРАНТЫ

Целью настоящей подпрограммы является поддержка лучших аспирантов в области физики, математики, химии, биологии. Отбор кандидатов на получение аспирантами Соросовских стипендий будет проведен на основании конкурса.

Для участия в конкурсе необходимо наличие по крайней мере одного из следующих достижений:

1. Публикация научных статей в реферируемых научных журналах.
2. Участие в качестве соисполнителей в грантах, полученных от различных научных фондов.
3. Научные сообщения, включенные в программы национальных и международных симпозиумов и конгрессов.
4. Участие в педагогическом процессе в качестве читающего спецкурс, ведущего семинары и/или практические занятия в течение полного семестра.

Каждый, обращающийся за получением стипендии Соросовского аспиранта, должен представить подтвержденные сведения о выполнении одного, нескольких или всех приведенных условий. Победители будут определены по совокупности этих показателей.

В процессе отбора Соросовских аспирантов будут приняты во внимание рекомендации Соросовских профессоров. Один профессор может рекомендовать одного аспиранта.

Грант Соросовского аспиранта является именным, выдается на один год и дает право получившему грант перейти с ним к любому руководителю в любую лабораторию по той же специальности, если руководитель согласится принять данного аспиранта. На таких же условиях выигравшие конкурс Соросовские аспиранты могут перейти из заочной аспирантуры в очную.

В первый год работы будет отобрано до 30 Соросовских аспирантов, которые получат стипендию сроком на один год.

Документы на конкурс должны поступить не позднее 10 ноября 1994 года. Решение Совета о присуждении грантов будет принято в течение трех месяцев.

### ПОДПРОГРАММА СОРОСОВСКИЕ СТУДЕНТЫ — СТИПЕНДИАТЫ

Целью настоящей подпрограммы является поддержка лучших студентов вузов Беларуси в области физики, математики, химии, биологии и наук о Земле. Отбор кандидатов на получение Соросовской стипендии будет проведен на основании конкурса, для участия в котором необходимо наличие по крайней мере одного из следующих достижений:

1. Победа в областных, республиканских или международных олимпиадах школьников.
2. Публикация научных статей в рецензируемых отечественных или зарубежных журналах (включая краткие сообщения и тезисы).
3. Участие в сообщениях, докладах или лекциях на национальных или международных симпозиумах, совещаниях, конгрессах в качестве соавтора.
4. Участие в качестве соисполнителя в исследовательских грантах, как отечественных, так и зарубежных.
5. Участие в реализованных авторских предложениях или изобретениях.
6. Наличие не более 5 % отметок «хорошо» и остальных «отлично» за три последовательных года обучения.

Каждый, обращающийся за получением Соросовской стипендии должен представить документальное подтверждение выполнения одного, нескольких или всех приведенных выше условий. Победители будут определены по совокупности этих показателей. Кроме того, право номинирования Соросовских стипендиатов предоставлено Соросовским профессорам — по одному студенту от каждого профессора.

Для поддержки высокого уровня соревнования среди студентов будут организованы ежегодные национальные конкурсы лучших научных работ.

В рамках настоящей подпрограммы будут выделены специальные гранты для тех студенческих научных обществ, которые проявят выдающиеся успехи в научной работе.

Соросовская стипендия составит 70 долларов США в месяц (в рублевом исчислении) на протяжении учебного года (10 месяцев) в дополнении к обычной стипендии, назначаемой студентам руководством вузов.

До 150 студентов планируется отобрать в течение первого года работы. Заявки на участие в конкурсе на звание «Соросовский студент-стипендиат» должны быть отправлены не позднее 31 октября 1994 года. Кандидатуры Соросовских студентов-стипендиатов, номинированных Соросовскими профессорами, принимаются до 1 декабря 1994 года. Имена Соросовских стипендиатов будут объявлены 15 декабря 1994 года, выплата стипендий будет осуществлена ретроактивно с начала осеннего семестра 1994/95 учебного года.

Контактный телефон в Минске: 0172-39-57-45. Почтовый адрес: 220072, г. Минск, пр. Ф. Скорины, 66, Международная Соросовская программа образования в области точных наук.

# БУМЕРАНГ ГАБЕЛЬСБЕРГЕРА

У Расію стэнаграфія прыйшла з Германіі ў 1863 годзе. Можа, хто і не пагодзіцца з намі, скажа, што і раней прыходзілі розныя сістэмы з Францыі, Англіі...

Так, прыходзілі. Але «прыходзілі» — гэта ж дзеяслоў незаконччанага трывання (незавершанае дзеянне). Ніяк не прыжываліся ў Расіі перапрацоўкі французскіх і англійскіх сістэм, бо гэтыя сістэмы таксама мелі выгляд... незавершаны.

Недахопы былі і ў нямецкай стэнаграфіі, але ўсё ж яна аказалася больш зручнай для рускай мовы. На падставе сістэмы Франца Ксаверыя Габельсбергера і другой нямецкай сістэмы, Вільгельма Штольцэ, развівалася руская стэнаграфія. У 1924 годзе з'явілася сістэма М. М. Сакалова. Праз колькі гадоў яна была палепшана і ўжо пераўзыходзіла сваю папярэдніцу — стэнаграфію нямецкую. Гэта натуральна, бо Сакалоў стаяў на плячах Габельсбергера, Штольцэ і іншых вялікіх стэнографаў мінуўшчыны.

Сістэма Сакалова доўгі час лічылася лепшай сярод рускіх і замежных сістэм. Яна і цяпер выкладаецца ў Маскве на завочных курсах стэнаграфіі.

У 1989 годзе ў нас, у БДУ, распрацавана новая сістэма — рытмічная стэнаграфія.

Не хацелася б ад свайго імя сцвярджаць, што наша сістэма лепшая за сістэму Сакалова. Але гэта пастаянна кажуць нашы вучні. Дык мы ўжо самі пачынаем верыць...

Выявілася, што наша рытмічная стэнаграфія валодае такімі якасцямі, якіх дамагаліся некалі ва Усходняй Германіі. Там стварылі спецыяльны камітэт і паставілі перад ім задачу спрасціць нямецкую стэнаграфію. Сістэма павінна засвойвацца за адзін семестр (пры дзвюх гадзінах заняткаў у тыдзень).

Менавіта за адзін семестр можна вывучыць нашу сістэму, прычым дастаткова займацца толькі адну гадзіну ў тыдзень. Пры больш шчыльным графіку заняткаў старшакласнікі і студэнты вывучаюць нашу стэнаграфію ўвогуле за адзін месяц.

На жаль, нам невядома, якія вынікі атрымаліся ў Германіі. Але зразумела, што добрыя думкі нараджаюцца не з нагоды стварэння камітэта ці абвяшчэння конкурсу на лепшую стэнаграфію. А з'яўляюцца яны, калі ім захочацца.

Відавочна, што ў Германіі і не дасягнулі жаданых вынікаў. Але ці нельга для стэнаграфіі нямецкай мовы выкарыстаць нашу рытмічную стэнаграфію? Прыстасавалі ж калісьці для рускай мовы нямецкую сістэму. Чаму б цяпер не зрабіць наадварот?

Паспрабавалі. Атрымліваецца някепска! Стэнаграфаваць нямецкую мову нават зручней, чым рускую (алфавіт у немцаў прасцейшы).

У цяперашні час на курсах стэнаграфіі пры Белдзяржуніверсітэце школьнікі і студэнты вучацца стэнаграфаваць не толькі па-руску, але і па-нямецку. Яны рыхтуюцца да работы стэнаграфісткамі, сакратарамі-рэферэнтамі ў сумесных беларуска-нямецкіх прадпрыемствах. Прыём на аддзяленне руска-нямецкай стэнаграфіі вядзецца штомесячна (вул. Бабруйская, 9, пакой 419, тэл. 68-70-30).

...Ад вялікага Габельсбергера прыйшла да нас стэнаграфія. І, нібы чароўны бумеранг, вярнулася яна сёння да нямецкай мовы, мовы Габельсбергера.

**У. ГЕРАСІМАЎ,**
**курсы стэнаграфіі**
**і машынапісу.**

● ШТО НОВАГА?

**З 7 па 9 кастрычніка ў Кіеўскім універсітэце праходзіла міжнародная выстаўка-кірмаш «Освіта-94». На выставе было прадстаўлена самае разнастайнае абсталяванне, якое можа быць выкарыстана пры адукацыі: пачынаючы ад дзіцячага століка і стала для аўдыторыі і заканчваючы складанай камп'ютэрнай, множыльнай і відэатэхнікай, дошкамі для аб'яў, дошкамі для аўдыторыі, на якіх можна пісаць не толькі крэйдай, а нават фламастэрам, дзіцячай школьнай формай, а таксама рознымі сістэмамі для вывучэння замежных моў і шмат іншага. Сярод удзельнікаў выставы былі такія фірмы, як IREX, RANK XEROX і інш.**

**Удзел у такіх выставах дае магчымасць, як кажуць, і на людзей паглядзець і сябе паказаць. Для ВНУ Беларусі — гэта лепшы метад зацікавіць замежных студэнтаў і атрымаць такім чынам валютныя сродкі, якія так неабходны універсітэтам і інстытутам. Але вельмі сумна, што з усёй Беларусі ўдзел у гэтай выставе прынялі толькі два прадстаўнікі Белдзяржуніверсітэта. І то — у якасці гледачоў.**

**І не дзіва: далёка не ўсім беларускім ВНУ па кішэні аплаціць свой удзел у такой выставе. Напрыклад, у гэты раз 1 кв. м выставачнай плошчы каштаваў 250 долараў. А плошча мусіла быць не менш за 9 кв. м. 250 долараў трэба было аддаць за рэгістрацыю, 150 долараў — за ўключэнне ў каталог. Гэта толькі прыклад, і, безумоўна, траты ўдзельнікаў не абмяжоўваліся толькі гэтымі сумамі. Але справа не толькі ў грошах. Арганізатары выставы маглі б пайсці насустрач БДУ і даць неабходную плошчу танней, а, можа, і зусім бясплатна, але... На жаль, мы не можам гэта выкарыстаць, таму што Белдзяржуніверсітэту проста няма чаго паказваць у якасці рэкламы.**

**Па словах нам. начальніка ўпраўлення па міжнародных сувязях Ю. Чабатарова, у наступным годзе ці праз год плануецца правядзенне падобнай выставы на базе Белдзяржуніверсітэта. Хочацца спадзявацца, што на той час мы зможам выглядаць больш-менш годна!**

**Вольга ХАДАРЭНКА**

# ТУСОЎКА

## СТУДЭНЦКІ ФАЛЬКЛОР ФІЛАСОФСКА-ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

### Гэта яшчэ трэба зразумець!

## Советы обидчику мух

1. Если вы хотите обидеть муху и не знаете, с чего начать, не огорчайтесь, так как многие этого тоже не знают. Первым делом следует определиться: какую именно муху вы будете обижать. Ваш выбор во многом определит вашу дальнейшую стратегию. Следует помнить, что встречаются и необидчивые мухи, поэтому не огорчайтесь, если не получится с первого раза. Итак, ваш выбор сделан.

2. Бытует мнение, что домашняя муха зачастую очень похожа на своего хозяина, копируя его привычки и недостатки. Это не совсем так, скорее, наоборот. У хорошей мухи не может быть плохого хозяина. Хотя, в некотором смысле, некоторые хозяева тоже паразиты. Неудивительно, что для того, чтобы понять характер мухи, прежде всего необходимо хорошенько разобраться в своем. Приступайте.

3. Не все золото, что блестит. То есть, я хотел сказать, присмотритесь получше к своему жилищу и задумайтесь, не поэтому ли муха считает ваш дом своим. Как вы сами понимаете, муха любит чистоту и порядок. В связи с этим, ПЕРВЫЙ СПОСОБ ОБИДЕТЬ МУХУ: не убирать некоторое время в квартире. Муха, само собой, обидится и перестанет убирать за собой тоже.

4. ВТОРОЙ И САМЫЙ НАДЕЖНЫЙ СПОСОБ: обделять вашу муху вниманием. Попробуйте в течение нескольких часов не побегать, играя мухобойкой в руке, с веселыми криками «Ах ты!.. Ах ты!.. Вот я тебя!..» за ней из комнаты в комнату, как ваша муха тотчас же захиреет и начнет биться головой о стеклянную стену незашторенного окна на кухне или в спальне. Еще хуже, если вы забудете накормить ее обедом с вашего стола или по какой-нибудь причине не захотите этого делать вообще. Тогда обиженная муха заберется в сахарницу с целью: «Что не съем, то хотя бы надкушу!» — и попробует это сделать.

5. Но не вздумайте сами обижаться на муху. Это грозит вам расстройством желудка, постоянной головной болью, а в худшем случае — хронической формой аллергии... И не делайте из мухи слона, ведь известно, что слон — огромное и тяжелое животное. Представьте, что ночью, когда вы будете спать, на вас усядется слон и будет преспокойно, будто ничего не случилось, мыть передними ногами свой хоботок.

6. Если по иронии судьбы у вас нет мухи, а в то же время хочется ее обидеть, заведите себе комара или моль. Но помните, что по аналогии с выбранным вами насекомым знакомые за вашей спиной могут называть вас вампиром или мелким вредителем. Чтобы избежать этого, заведите себе таракана и тогда вы будете с ними в равных условиях.

7. То же относительно грызунов. Например, мышь бывает полевая, домовая и еще черт знает какая... В домашних условиях мышь жрет что попало: от сыра до кухонных табуреток, а если поймает муху, то, безусловно, сожрет и ее. Поэтому ТРЕТИЙ СПОСОБ ОБИДЕТЬ МУХУ: завести себе мышь. Мухе будет обидно, что не перед ней, а перед мышью вы будете вскакивать с визгом на табуретку и вопить что есть мочи: «Спасите!.. Помогите!..» — и от горя бросится прямо в сеть к пауку, который сам по себе уже является ЧЕТВЕРТЫМ СПОСОБОМ ОБИДЕТЬ МУХУ, этого самого близкого в дарвиновском эволюционном дереве человеку насекомого.

8. Дихлофосом муху обидеть нельзя. Какая может быть обида от кайфа?!

9. Если вы считаете, что ваша муха вам изменяет тем, что усаживается слишком часто и, как вам кажется, слишком сексапильно на лысину вашему гостю, значит вы ревнивы. Если нет — значит, нет.

10. И вообще: «Скажи мне, кто твой мух, и я скажу, кто ты».




●●●

**СТРОИТЕЛЬ:** Можно получить ваш автограф?

**ПРОХОЖИЙ:** Конечно, можно. Да только зачем он вам?

**СТРОИТЕЛЬ:** На память, конечно.

**ПРОХОЖИЙ:** Но ведь я еще не знаменит!?

**СТРОИТЕЛЬ:** Не важно!

**ПРОХОЖИЙ:** Однако... (Дает автограф)

**СТРОИТЕЛЬ:** Спасибо и прощайте.

**ПРОХОЖИЙ:** Прощайте...

В этот момент ПРОХОЖЕМУ на голову падает кирпич.

●●●

**МАЛЬЧИК:** Я — никого и ничего не боюсь!

**ЕГО ОТЕЦ:** А ремня?!

**УЧИЛКА:** Это не педагогично.

**МАЛЬЧИК:** Я боюсь только одного — папы с ремнем.

**УЧИЛКА:** А собак?!

**ОТЕЦ МАЛЬЧИКА:** Собак боюсь я...

**УЧИЛКА:** Но ведь они такие добрые и милые!?

**МАЛЬЧИК:** Ну и что!? Если собаку хорошенько раздразнить...

**ЕГО ОТЕЦ:** Б-р-р.



●●●

Один мудрец сказал.
Другой ему ответил.
И вот теперь бедлам
Творится на планете.

●●●

Осень наступила,
Высохли цветы.
Сессия наступит —
Высохнешь и ты.




Рисунки Опричя Кромешнего

●●●

**СЛОН:** Я — слон, я большой и толстый!..

**МЫШЬ:** Я — маленькая, гадкая и «затыренная»...

**ГЕГЕЛЬ:** Я — Гегель, я — гораздо круче Шеллинга!..

**ШЕЛЛИНГ:** (Гегелю): Жора-обжора!!.

**ГЕГЕЛЬ** громко топает ногой. **МЫШЬ** пищит. **СЛОН** пугается и умирает. **ШЕЛЛИНГ** довольный ложится спать, но просыпается в холодном поту. Над его кроватью склонилось ухмыляющееся лицо ГЕГЕЛЯ, который поливает его водой из чайника. Из Абиссинии доносятся некоторые аккорды похоронного марша, под который хоронят СЛОНА.

●●●

*Ни для кого не секрет, что в нашем доме живут очень странные люди.— Взять хотя бы меня!..*

●●●

Травка пожелтела, высохла совсем — это снова шутка фирмы «МММ».

●●●

Старуха с толстым кошельком
по улице идет,
И своим грязным кулаком
к прохожим пристает.
Почто, старуха, пристаешь?!
Ответствуй!.. Не юли!..
Могла б работать за станком
за эти вот рубли!..
Молчит старуха, не дыша. От
страха — чуть жива.
Потом в сторонку отошла —
и тихо умерла.
Мне денег, в принципе, не
жаль... Ведь счастье — не в
деньгах.
Но сердце у меня — как
сталь, ему не ведом страх.

●●●

*Жила-была Василиса Прекрасная, и в один прекрасный день увлек ее Трехголовый Змей-Горыныч в свое подземное царство, прельщенный женской красотой. Прослышал про то Иван-дурак, взял, как полагалось, дубину потяжелее, нашел Змеево логово, избил оного Змея нещадно, а Василису Прекрасную забрал с собой. На радостях сыграли свадьбу. И родились у них три сына... о трех головах.*

●●●

Раннее утро. В ресторан входит очень красивая блондинка. Садится за свободный столик. Услужливый официант предлагает ей:

— Вино, коньяк, шампанское?!.

Девушка (с трудом сглатывая слюну):

— Нарзану мне, нарзану.

●●●

**КАМЕР-ЮНКЕР ХРЯК:** Прекрасное утро, сударыня!..

**ДЕВКА НЕГЛИЖЕ:** Оставьте ваши дурацкие шуточки!..

**ГАРСОН:** Вам кофе в постель или как?!

**КАМЕР-ЮНКЕР ХРЯК:** Или как.

**ДЕВКА НЕГЛИЖЕ:** Ах! Оставьте эти ваши дурацкие шуточки!..

**ГАРСОН:** А может ей по башке дать для профилактики?

**КАМЕР-ЮНКЕР ХРЯК:** Пожалте-с.

**ДЕВКА НЕГЛИЖЕ:** Прекратите! Я — лицо неприкосновенное!..

**ГАРСОН и КАМЕР-ЮНКЕР ХРЯК** (вместе): «Ах! Оставьте ваши дурацкие шуточки!..»

●●●

Красивые речи она говорила,
но не любила, нет! — не
любила!..
И больше не строит мне
глазки свои
В дебрях глухих философии-и,
философии-и-и.

●●●

## ДИССОНАНСЫ

Я скоро получу диплом
Ярко-зеленого цвета.
Куплю на радостях лимон,
Бутылку «Кабенета».
С ним заявлюсь к себе
домой,
Скажу: «Ну что!.. Не
ждали!..»
Теперь раскрылись предо
мной
Глухие, туманные дали...

Возьму диплом и с ним
пойду
Куда-нибудь работать.
Возможно, сторожем
возьмут —
Вот это будет новость!..

Завидно станет всем
вокруг —
Устроился-то как!..
Ведь я ж тебе не политрук,
А значит — не дурак!

На сторожихе я женюсь
Из бывших — из актрис.
Сын увенчает наш союз —
Философ и артист.

Как подрастет — пошлю
его
На ФЭФ при БГУ,
Пусть тоже станет
мужиком
На радость старику.

Ему, быть может, повезет:
Получит он диплом;
И с тем дипломом в тот
же год
В родной вернется дом.

И как-то тихим вечерком
В гостиной при свечах
Вдвоем, от матери тайком,
На риск на свой и страх

Поговорим о том, о сём:
О Канте, о Кюри...
И пусть за маленьким
окном
Воркуют глухари.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

20 кастрычніка
Зак. 1777.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара Т. М. КАЗАК

Газета падпісана ў друк у 16.00.